ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2020 № 275

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў**
**«Мастацтва выцінанкі»**
для V–VI класаў устаноў адукацыі,
якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Мастацтва выцінанкі» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вучняў V–VI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 70 гадзін (35 гадзін у кожным класе, 1 гадзіна на тыдзень).

3. Мэта – фарміраванне мастацкай культуры сродкамі традыцыйнай беларускай выцінанкі.

4. Задачы:

вывучэнне і асэнсаванне нацыянальных традыцый беларускай выцінанкі;

развіццё здольнасцей эмацыянальна ўспрымаць багацце беларускай культуры;

фарміраванне практычных уменняў і навыкаў пры рабоце над выцінанкай;

выхаванне патрыятызму, працавітасці, добрасумленнасці.

5. Формы і метады навучання і выхавання рэкамендаваны з улікам узроставых асаблівасцей вучняў V–VI класаў, змястоўнага і працэсуальнага кампанентаў вучэбнага матэрыялу. Вучэбныя заняткі можна будаваць на аснове традыцыйнай структуры (арганізацыйная, тэарэтычная, практычная, заключная часткі) ці правадзіць у нестандартнай форме (заняткі-выстава, заняткі-конкурс майстэрства, заняткі-семінар, заняткі-экскурсія).

На вучэбных занятках можна спалучаць індывідуальныя і групавыя формы работы, даваць вучням заданні рознай ступені складанасці. Трэба шырока выкарыстоўваць наглядныя метады навучання – дэманстрацыю ўзораў работ, фотаздымкаў, ілюстрацыю. У раздзеле «Тэматычная праца», дзе вучэбныя заняткі прысвечаны святам і абрадам, для развіцця творчых здольнасцей вучняў лепш дэманстраваць схемы работ ці тэхналагічныя карты, а таксама выкарыстоўваць метад пагружэння і самастойнай работы з тэарэтычнымі звесткамі.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выяўляюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны:

6.1. веды аб паходжанні і асаблівасцях беларускай выцінанкі, асновы кампазіцыйнай пабудовы выцінанкі, метады стылізацыі, сімволікі абярэгаў, калядныя і купальскія сімвалы, адметныя рысы еўрапейскай і беларускай выцінанкі; асаблівасці рытму ў выцінанцы;

6.2. уменні будаваць кампазіцыйную схему рапортнай, цэнтрычнай, сіметрычнай і асіметрычнай выцінанкі з выкарыстаннем геаметрычных і раслінных матываў, выкарыстоўваць знакавую сімволіку ў тэматычных працах, зааморфныя і антрапаморфныя вобразы;

6.3. навыкі будаваць схемы выцінанкі з улікам рытму і непадзельнасці кампазіцыі.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

V клас (35 гадзін)

Тэма 1. Гісторыя выцінанкі (1 гадзіна)

Паходжанне выцінанкі: характарыстыка выцінанкі як віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гісторыя развіцця. Матэрыял для выцінанкі. Сувязь з побытам. Асноўныя віды выцінанкі і іх асаблівасці.

Тэма 2. Асаблівасці беларускай выцінанкі (1 гадзіна)

Сэнс адтулін, характэрны для беларускай выцінанкі, сюжэты беларускай выцінанкі. Узоры выцінанак беларускіх майстроў сучаснасці. Паслядоўнасць выканання.

Тэма 3. Кампазіцыя (4 гадзіны)

Кампазіцыя і яе асаблівасці ў выцінанцы, аналіз узораў. Выкананне практыкаванняў на вызначэнне кампазіцыі і віда выцінанкі.

Арганізацыя плоскасці, паняцце раўнавагі: законы кампазіцыі ў выцінанцы, размяшчэнне элементаў кампазіцыі, выкананне эскізаў выцінанак.

Метады стылізацыі: паняцце аб стылізацыі, роля стылізацыі ў выцінанцы, метады і прыемы стылізавання выяў. Практыкаванні па стылізацыі аб’ектаў навакольнага асяроддзя.

Тэма 4. Рапортная выцінанка (2 гадзіны)

Геаметрычныя матывы ў рапортнай выцінанцы: паняцце аб рапортнай выцінанцы, геаметрычныя элементы, іх сімвалічнасць, кампазіцыйнае размяшчэнне.

Раслінныя матывы ў рапортнай выцінанцы: сімвалічнасць раслінных матываў, стылізацыя расліннага свету, кампазіцыйнае размяшчэнне элементаў раслінных матываў.

Тэма 5. Цэнтрычная выцінанка (4 гадзіны)

Геаметрычныя матывы ў цэнтрычнай выцінанцы: паняцце цэнтра ў выцінанцы, асаблівасці цэнтрычнай выцінанкі, правільнае размяшчэнне элементаў кампазіцыі ў цэнтрычнай выцінанцы з геаметрычнымі матывамі. Мандала. Сімвалічны і філасофскі сэнс: паняцце аб «мандале», асаблівасці яе выявы, сэнс сімвалаў, сувязь з побытам людзей, паслядоўнасць выканання.

Раслінныя матывы ў цэнтрычнай выцінанцы: правілы кампазіцыйнага размяшчэння стылізаваных элементаў раслін, восі сіметрыі, паўторы.

Тэма 6. Тэматычная праца (6 гадзін)

Калядныя матывы ў выцінанцы: сувязь выцінанкі са святамі беларусаў, іх адлюстраванне ў выцінанцы, сімвалічнасць сюжэтаў. Каляды і іх сімвалы. Стылізацыя сімвалаў Калядных святаў у выцінанцы.

Калядныя паштоўкі: элементы калядных сімвалаў у выцінанцы, іх памер і размяшчэнне, стылізацыя.

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму «Прыйшла Каляда»: калядныя сімвалы, распрацоўка эскіза, кампазіцыйнае размяшчэнне элементаў, паслядоўнасць выканання, тэхніка бяспекі пры рабоце з нажніцамі.

Тэма 7. Кампазіцыя (2 гадзіны)

Сіметрычная і асіметрычная раўнавага. Раўнавага асобных элементаў кампазіцыі: паняцце сіметрыі і асіметрыі ў выцінанцы, аналіз узораў.

Тэма 8. Сіметрычная (люстэркавая) выцінанка (4 гадзіны)

Геаметрычныя матывы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: асаблівасці размяшчэння геаметрычных элементаў у сіметрычнай выцінанцы, паслядоўнасць выканання сіметрычнай выцінанкі.

Раслінныя матывы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: сіметрыя ў выцінанцы з элементамі раслін, кампазіцыйныя асаблівасці выцінанкі з раслиннымі матывамі.

Тэма 9. Асіметрычная выцінанка (4 гадзіны)

Геаметрычныя матывы ў асіметрычнай выцінанцы: асіметрыя ў выцінанцы з геаметрычнымі элементамі, законы кампазіцыйнага размяшчэння, паслядоўнасць выканання.

Раслінныя матывы ў асіметрычнай выцінанцы: кампазіцыя асіметрычнай выцінанкі з раслиннымі матывамі, асаблівасці выканання.

Тэма 10. Тэматычная праца (3 гадзіны)

Купальскія матывы ў выцінанцы: абрады свята Купалле, сімвалы свята, іх стылізацыя для выцінанкі, кампазіцыйнае размяшчэнне.

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі «Папараць-кветка»: распрацоўка эскіза, кампазіцыя, паслядоўнасць работы, работа ў матэрыяле.

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму «Купальская ноч»: стварэнне эскіза, размяшчэнне элементаў кампазіцыі, выкананне ў матэрыяле.

Тэма 11. Праца на вольную тэму (3 гадзіны)

Тэма 12. Выніковая выстава вучнеўскіх работ (1 гадзіна)

VI клас (35 гадзін)

Тэма 1. Гісторыя выцінанкі (1 гадзіна)

Распаўсюджванне выцінанкі як віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Еўропе і ў Беларусі: развіцце выцінанкі ў Еўропе, сувязь з папяровай вытворчасцю, майстры выцінанкі Еўропы і Беларусі.

Тэма 2. Кампазіцыя (1 гадзіна)

Паняцце рытма і непадзельнасці кампазіцыі: рытм у кампазіцыі, асаблівасці рытма ў выцінанцы, кампазіцыйная ідэя і сэнс.

Тэма 3. Асаблівасці беларускай выцінанкі (2 гадзіны)

Рытм у беларускай выцінанцы: адметнасці беларускай выцінанкі, вобразы (зааморфныя і антрапаморфныя) у беларускай выцінанцы, асаблівасці выканання.

Тэма 4. Рапортная выцінанка (4 гадзіны)

Зааморфныя вобразы ў рапортнай выцінанцы: сімвалічнасць зааморфных вобразаў, стылізацыя зааморфных вобразаў, кампазіцыйнае размяшчэнне, паслядоўнасць выканання.

Антрапаморфныя вобразы ў рапортнай выцінанцы: значэнне выяў чалавека ў выцінанцы, кампазіцыя антрапаморфных вобразаў у рапортнай выцінанцы, асаблівасці выканання.

Тэма 5. Цэнтрычная выцінанка (4 гадзіны)

Зааморфныя вобразы ў цэнтрычнай выцінанцы: правілы размяшчэння зааморфных вобразаў у цэнтрычнай выцінанцы, рытм і паўторы выяў, паслядоўнасць выканання.

Антрапаморфныя вобразы ў цэнтрычнай выцінанцы: вобразы чалавека ў цэнтрычнай выцінанцы, сімвалічнасць вобразаў, іх кампазіцыйнае размяшчэнне, этапы выканання.

Тэма 6. Тэматычная праца (6 гадзін)

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму «Дрэва жыцця»: сімвалічнасць вобраза «дрэва жыцця», кампазіцыйны аналіз узораў, састаўленне эскіза, выкананне ў матэрыяле.

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму «Птушка шчасця»: сэнс вобраза птушкі ў беларускай міфалогіі, «птушка шчасця» ў выцінанках беларускіх майстроў, распрацоўка эскіза, работа ў матэрыяле.

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму «Пяруновыя стрэлы»: бог Пярун у беларускай міфалогіі, стылізацыя агню, кампазіцыйнае размяшчэнне элементаў распрацаванага эскіза, паслядоўнасць выканання ў матэрыяле.

Тэма 7. Сіметрычная (люстэркавая) выцінанка (4 гадзіны)

Зааморфныя вобразы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: стылізацыя зааморфных вобразаў для сіметрычнай выцінанкі, асаблівасці размяшчэння зааморфных вобразаў у сіметрычнай выцінанцы, рытм і восі сіметрыі, этапы выканання сіметрычнай выцінанкі.

Антрапаморфныя вобразы ў сіметрычнай (люстэркавай) выцінанцы: кампазіцыя ў сіметрычнай выцінанцы з антрапаморфнымі вобразамі, паслядоўнасць выканання.

Тэма 8. Асіметрычная выцінанка (4 гадзіны)

Зааморфныя вобразы ў асіметрычнай выцінанцы: асіметрыя пры распрацоўцы выцінанкі з зааморфнымі вобразамі, кампазіцыйная ідэя, стылізацыя вобразаў, паслядоўнасць работы.

Антрапаморфныя вобразы ў асіметрычнай выцінанцы: сімвалічнасць антрапаморфных вобразаў, стылізацыя зместу асіметрычнай выцінанкі з антрапаморфнымі вобразамі, кампазіцыйнае размяшчэнне, паслядоўнасць выканання ў матэрыяле.

Тэма 9. Тэматычная праца (6 гадзін)

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму «Зажынкі»: сімвалічнасць свята, абрадавыя асаблівасці, стылізацыя элементаў, кампазіцыйнае размяшчэнне, распрацоўка эскіза, выкананне ў матэрыяле.

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму «Хлябок»: абрады і вобразы свята, кампазіцыйнае рашэнне выцінанкі, распрацоўка эскіза, паслядоўнасць работы ў матэрыяле.

Практычныя заняткі. Выкананне выцінанкі на тэму жніўеньскіх прыказак і прымавак: прыклады беларускіх прымавак і прыказак пра збор ураджаю, вобраз хлеба, распрацоўка эскіза, кампазіцыйнае размяшчэнне, работа ў матэрыяле.

Тэма 10. Праца на вольную тэму (2 гадзіны)

Тэма 11. Выніковая выстава вучнеўскіх работ (1 гадзіна)